костел или клуб, в котором в первые дни войны проходили самые ожесточенные бои.

Суммарные потери германской армии на восточном фронте к 30 июня 1941 года составили 8886 убитых.

Память войны стучит метрономом.

## ПАЛІТЫКА ГЕНАЦЫДУ І "ВЫПАЛЕНАЙ ЗЯМЛІ" НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

Рукша Г.М., 1 к., 5 гр., ЛФ
*Кафедра гуманітарных навук*
*УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт"*
*Навуковы кіраўнік – загадчык кафедры, дацэнт Сіткевіч С.А.*

Летам 2012 г. спаўняецца 68 год з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Тыя незабыўныя падзеі заўсёды выклікалі зацікаўленнасць з боку даследчыкаў. У гэтым сэнсе актуальным бачыцца разгляд тэмы маёй працы.

Мэта маёй работы – паказаць звярыны твар фашызму, паказаць, якое гора і бяда мелі месца на маёй зямлі ў гады акупацыі. Задачы даследавання: расказаць пра трагедыю, што адбылася на беларускай зямлі ў гады вайны, пра акупацыю Беларусі, пра спаленыя беларускія вёскі разам з жыхарамі, пра фашысцкую палітыку генацыду і "выпаленай зямлі", падаючы праўдзівыя факты пра боль, пакуты і цярпенне нашага народа ў гады вайны, ўключыўшы ў работу найбольш адметныя падзеі. Аб'ектам даследавання з'яўляецца становішча беларускіх зямель у гады Вялікай Айчыннай вайны, прадметам – палітыка генацыду і "выпаленай зямлі". Працуючы над тэмай, я выкарыстоўвала наступныя навуковыя метады: гістарычны, параўнальны, метад аналізу і сінтэзу. Для напісання працы мной былі выкарыстаны архіўныя матэрыялы, манаграфічныя даследаванні, мемуары, навуковыя і публіцыстычныя артыкулы, успаміны непасрэдных удзельнікаў падзей.

Генацыд – адзін з цяжэйшых відаў злачынства супраць чалавецтва. Вынікам нацысцкай палітыкі генацыду і "выпаленай зямлі" у Беларусі з'явілася знішчэнне звыш 2 мільёнаў 200 тысяч грамадзян. Ніколі яшчэ гісторыя войн не мела такой колькасці прыкладаў грубых парушэнняў законаў і звычаяў вайны, як гэта



Репозиторий ГрГМУ

стварыў нацызм, які узвёў ваенныя злачынствы ў ранг афіцыйнай дзяржаўнай палітыкі.

16 ліпеня 1941 г. на нарадзе вышэйшых кіруючых асоб гітлераўскай Германіі канчаткова афармілася фашысцкая сістэма нацысцка-тэрарыстычнага рэжыму. Генеральны план “Ост” вызначаў праграму каланізацыі захопленых тэрыторый, германізацыі, высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы, у адпаведнасці з якім 80% насельніцтва Беларусі меркавалася знішчыць ці выселіць за Урал, 20% анямечыць і прымусіць працаваць на немцаў-каланістаў.

Тэрыторыя генеральнай акругі Беларусі, якая складала прыкладна 1/3 тэрыторыі БССР, была ўключана ў рэйхскамісарыят “Остланд” з рэзідэнцыяй у Рызе і падзелена на 10 акругоў. На чале генеральнай акругі Беларусь стаяў генеральны камісарыят, які ўзначальваў Вільгельм фон Кубэ. Пасля забойства Кубэ мінскімі падпольшчыкамі 22 верасня 1943 г. яго месца заняў групэнфюрар войск СС Курт фон Готтберг. Для зберажэння грамадскага парадку і бяспекі на тэрыторыі Генеральнага камісарыяту Беларусі 1 ліпеня 1941 г. гітлераўцы аддалі распараджэнне, на аснове якога кожны абавязаны быў неадкладна заяўляць немцам аб з’яўленні бальшавікоў, іх прыхільнікаў; забаранялася знаходжанне на вуліцы ў перыяд з 21 гадзіны вечара да 5 гадзін раніцы (выключэнне складалі асобы, якія мелі асабістыя пасведчанні).

У галіне эканомікі акупацыйны рэжым прынес працоўным Беларусі страшэнную галечу, звышэксплуатацыю, адкрытае рабаванне матэрыяльных каштоўнасцей. Гітлераўцы вывозілі нашых людзей на катаржныя работы ў Германію, дзе людзі гінулі ад непасільнай працы, розных хвароб, здзекаў, голаду.

Загадзя распрацаваная гітлераўцамі праграма знішчэння нашых людзей прадугледжвала стварэнне цэлай сістэмы канцэнтрацыйных лагераў смерці. На тэрыторыі Беларусі іх было 260. Адзін з першых лагераў смерці быў арганізаваны ў вёсцы Дразды недалёка ад Мінска. На 10 ліпеня 1941 г. тут знаходзілася каля 140 тысяч вязнеў ва ўзросце ад 15 да 60 год. Самым буйным лагерам смерці і месцам масавага знішчэння людзей у Беларусі быў Трасцянец – трэці па колькасці

Рэпазіторый ГрГМУ

знішчаных у сістэме ўсіх фашысцкіх лагераў смерці. Тут загінула больш за 206 тысяч чалавек.

Гітлераўцы ішлі на самыя неверагодныя злачынствы. У Бабруйску немцы наўмысна падпалілі казармы лагера, а потым учынілі расстрэл выбягаючых з будынкаў ваеннапалонных. У выніку гэтай правакацыі было расстраляна звыш тысячы чалавек. Усяго у лагерах смерці на тэрыторыі Беларусі нацысты знішчылі звыш 1 мільёна 400 тысяч чалавек.

У час акупацыі гітлераўцы правялі ў Беларусі звыш за 140 карных экспедыцый, ператвараўшых цэлыя раёны ў "зоны пустыні". За гады акупацыі разам з жыхарамі спалена 628 беларускіх вёсак, 186 з якіх так і не адноўлены пасля вайны. У гады вайны загінуў кожны чацвёрты жыхар краіны. Увесь свет ведае трагедыю вёскі Хатынь, у якой было спалена жывымі 149 чалавек. У снежні 1942 г. у Дзятлаўскім, Лідскім, Магілёўскім, Навагрудскім, Слонімскім, Шчучынскім раёнах Гродзенскай вобласці фашысты правялі карную аперацыю пад назвай "Гамбург", у выніку якой было забіта каля 6 тысяч чалавек. У ліпені – жнівені 1943 г. імі была праведзена карная аперацыя "Герман".

Аб садызме фашысцкіх карнікаў на тэрыторыі Беларусі расказваюць справаздачы саміх фашыстаў, якія штодзённа педантычна падлічвалі свае ахвяры і пісьмова паведамлялі сваё кіраўніцтва аб "дасягненнях", а таксама сведкі – жывыя людзі, цудам застаўшыяся ў жывых, пазбегшыя смерці. Але як бы вораг не здзекваўся над беларускім народам, яму не ўдалося зламаць стойкасць і мужнасць нашых людзей. З першых дзён вайны асноўная частка насельніцтва Беларусі стала на шлях барацьбы супраць акупантаў.

Цяжкім выпрабаваннем вайна стала для жыхароў Гродна: за час акупацыі, якая працягвалася з 23 чэрвеня 1941 г. па 16 ліпеня 1944 г., было знішчана 33 тысячы чалавек. За любыя парушэнні, непадпарадкаванне ўказанням улада прадугледжваліся меры пакарання: смяротная кара, расстрэл.

У першыя дні вайны ўсе магазіны, гандлёвыя склады і базы былі разгромлены. Гэта стварыла цяжкасці ў забеспячэнні насельніцтва на першых парах. На атрыманне прадуктаў выдаваліся харчовыя карткі. Нормы былі вельмі мізэрнымі.



Рэпазіторый ГрГМУ

На тэрыторыі Гродна за гады вайны было створана 5 лагераў і 4 аддзяленні, у якіх знішчаны каля 35 тысяч чалавек. Лагеры размяшчаліся ў раёне Фолюша, вёсак Ласосна, Калбасіна (шталаг 353), Кульбакі, па вуліцы Чырвонаармейскай (шталаг 324).

Злейшымі ворагамі і расава непаўнацэннай нацыяй фашысты аб'явілі яўрэяў. З першых дзён яўрэйскае насельніцтва Гродна стала падвяргацца дыскрымінацыі з боку акупантаў. На 29 ліпеня 1941 г. ў Гродна пражывала 18 тысяч 560 яўрэяў. Асобы яўрэйскай нацыянальнасці праследаваліся. Усе яны ад 16 да 60 год былі ўключаны ў сістэму прымусовых работ на карысць германскіх улад без усякай аплаты.

У кастрычніку акупацыйныя ўлады аб'явілі аб стварэнні ў Гродна двух гета для яўрэяў – гета № 1 (начальнік гета Курт Візэ) і гета № 2 (начальнік Отта Стрэблеў). 12 сакавіка 1943 г. ў горадзе з'явілася аб'ява аб тым, што Гродна ачышчана ад яўрэяў. Гродзенскае гета было ліквідавана. Выратавацца з гета ўдалося нямногім. На тэрыторыі Гродзенскай вобласці за гады акупацыі было знішчана цалкам 64 і часткова 97 населеных пунктаў, усяго двароў – 8428, чалавечыя страты склалі 116089 мірных жыхароў, у тым ліку 7293 жанчыны і 5916 дзяцей.

У нашы дні можна ўбачыць праявы фашызму. Ён такі, як і ў 30-я – пачатку 40-х гадоў. У наш час на этнічнай глебе генацыду падверглася ціхая цэнтральна-афрыканская краіна Руанда. У 1994 г. яна была адной з найбяднейшых краін свету і стала арэнай жорсткай братазабойчай бойні. За тры месяцы, што дзейнічала тут машына смерці, у Руандзе загінула звыш 1 мільёна чалавек, тысячы былі пакалечаны, згвалтаваны, засталіся сіротамі. Яшчэ да 2002 г. ў некаторых раёнах краіны знаходзілі непахаваныя астанкі ахвяр гэтага страшэннага злачынства.

Як і раней, так і сёння, у XXI стагоддзі, наша краіна ўсімі сіламі і сродкамі змагаецца за мір. Зямля беларуская шчодра паліта крывёю сыноў і дачок усіх народаў былога Савецкага Саюза, многіх народаў Еўропы. Амаль кожная беларуская дарога прыводзіць да брацкай ці адзіночнай магілы, да помніка, архітэктурнага знаку ці мэмарыяльнага комплексу, увекавечыўшых подзвіг герояў Вялікай Айчыннай вайны і



Рэпазіторый ГрДМУ

памяць ахвяр фашысцкага тэрору. Шмат у нас такіх свяшчэнных мясцін – звыш 8 тысяч. Памяць, увасобленая ў мармуры, бронзе, граніце, жалезабетоне, становіцца вечнай, пераходнай ад аднаго пакалення да другога. Гэта бачная памяць народа. Падыйдзіце да абеліску і зрабіце паклон Вечнаму агню. Нізка схіліце галовы перад памяццю герояў, зрабіўшых усё для нашай свабоды, шчасця і светлай будучыні. Памяць неабходна жывым, каб, гледзячы на веліч мінулага, будаваць дзень заўтрашні. Пад тысячамі абеліскаў па ўсёй беларускай зямлі вечным сном спяць мільёны тых, хто не вярнуўся з вайны. І пакуль б'юцца нашы сэрцы, мы не маем права ў паўсядзённых радасцях і клопатах забываць аб іх подзвігу. Гісторыю не павярнуць назад, але важна ведаць асноўнае: калі пракладваеш шлях у новае, нельга забываць мінулае, яго ўрокі. Мір – вось што патрэбна чалавеку. Мір без вайны!

## КОНТРНАСТУПЛЕНИЕ СОВЕТСКИХ ВОЙСК ПОД ЖЛОБИНОМ

Сакович А.С., 2 к., 214 гр., МДФ
*Военная кафедра*
*УО «Гомельский государственный медицинский университет»*
*Научный руководитель – ст. преподаватель, подполковник м/с Осмоловский Д.П.*

Общеизвестно, что именно на землях восточной части Беларуси и Смоленской области Российской федерации в июле – августе 1941г. развернулось одно из крупнейших сражений начального периода Великой Отечественной войны, в известной степени предопределившее срыв гитлеровского плана «молниеносной войны». К началу сражения под Смоленском у противника попрежнему было больше сил и средств. Он превосходил советские войска в людях почти в 2 раза, в орудиях и минометах – 2,4, в самолетах – 4 раза.

21-я армия на самом южном фланге Западного фронта (штаб – Гомель) оказалась вне полосы нового немецкого наступления. В "Военном дневнике" Ф. Гальдера отмечались активные перевозки советских войск в районе Гомеля, однако их значение немецкое командование долго не могло понять. 13 июля Ф. Гальдер перечислил, в числе прочих, "гомельскую группировку противника",



Репозиторий ГомГМУ